**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у X клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў кадэцкіх вучылішчах**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

## Буслы над казармай

Ваенны гарадок стаяў каля рэчкі, на беразе якой расла старая бяроза. На вяршыні дрэва буслы зрабілі сабе гняздо.

Увосень птушкі адляцелі ў вырай. Аднойчы моцны вецер паваліў бярозу з буслянкай. Салдаты пашкадавалі птушак, якія засталіся без гнязда. Узялі жалезную трубу, укапалі ў зямлю, зверху прымацавалі аўтамабільную пакрышку. На яе ўскінулі галлё, што засталося ад гнязда.

Прыйшла вясна. Неяк раніцай пара буслоў нізка праляцела над казармамі. Птушкі падляцелі да таго месца, дзе расла бяроза. Не ўбачыўшы дрэва, яны трывожна заклекаталі і пачалі кружыцца. Усе падумалі, што буслы паляцяць адсюль, але раптам птушкі сталі зніжацца. Праз некаторы час вывеліся бусляняты.

Не раз салдаты прыносілі для буслоў пачастунак: булку, рыбу, каўбасу. Бусліха злятала ўніз, брала ежу і клекатала, дзякавала салдатам.

Усё лета буслы лярталі над ваенным гарадком. Але прыйшоў час зноў выпраўляцца ў вырай. Паляцелі туды два старыя і пяць маладых буслоў.

(142 словы)

*Паводле В. Хомчанкі*